НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

№ 21 (111), СНЕЖАНЬ 2010 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

# ЁН ПРАЙГРАЎ

На фініш выйшла чарговая выбарчая імітацыя. Значным яе адрозненнем ад папярэдняй стала вялікая колькасць кандыдатаў і адпаведна больш час іх выступаў на радыё і тэлебачанні. Разам з гэтым была адпаведна большая магчымасць свабодна збіраць подпісы, а таксама весці агітацыю.

І выбаршчыкі мусяць задумацца: “Чаму гэта адбываецца зараз, а не ў 2006 годзе?”. І адказ на гэта зусім просты. Арганізатар выбарчай кампаніі ўжо прайграў. Пачаўшы сваю дзейнасць з тэзы “я краіну за цывілізаваным светам не павяду” праз 15 гадоў вымушаны ў цывілізаванага свету браць шматлікія крэдыты і падпарадкоўвацца пакуль фармальна правілам паводзінаў у цывілізаваным свеце: актывістаў не штрафаваць, агітаваць даваць свабодна. Але пакуль засталася адна мяжа на якой ён стаіць “на смерць” – падлік галасоў выбаршчыкаў. Кіраваць гэтай місіяй яго вертыкаль давярае толькі праверанным неаднаразова надзейным супрацоўнікам. Бо менавіта яны напішуць у пратаколах тое, што скажуць зверху.

І гэта стоадсоткавае сведчанне таго, што дэмакратычныя выбары наш кіраўнік прайграў. А гульня вядзецца па правілах, якія даюць магчымасць фальсіфікацый, маніпуляцый з бюлетэнямі выбаршчыкаў. Калі б у краіне існаваў падзел уладаў, то гэты фарс даўно быў бы спынены. Але ж у нас галіны ўлады растуць з аднаго ствала – вертыкалі. І адпаведна астатнія галіны ўлады – прадстаўнічая, праваахоўчая, СМІ -- выконваюць усе каманды вертыкалі.

Пра тое, што ён прайграў, кажуць і кандыдаты з гэтай кампаніі, якія добра ведаюць вартасць усіх абяцанняў дзеючага рэжыма. Мікола Статкевіч прама патрабуе: “Вярні тое, што скраў – выбары”. Уладзімір Някляеў заяўляе, што ён прайграў, бо пасварыўся з Расіяй. Андрэй Саннікаў патрабуе даследавання справы знікнення вядомых палітыкаў: Захаранкі, Ганчара і іншых. Віталь Рымашэўскі заяўляе, што выбіралі прэзідэнта, а атрымалі цара.

Для мяне ён асабіста прайграў таму, што яго улада трымаецца на распаўсюду страху праз контрактную сістэму і кантралюючыя органы, гвалту над правамі і свабодамі грамадзян пры буйнай дэмагогіі праз манаполію дзяржаўных СМІ. Для мяне ён прайграў, бо яго сістэма не здольна справіцца з выміраннем нацыі. За час яго кіравання нас стала менш амаль на 700 тысяч. Пры гэтым на Віцебшчыне сельскія раёны паменялі амаль на трэць. Нас паменшыла на Гарадоччыны значна больш, чым у Вялікую Айчынную вайну. І здзекам гучаць словы яго прапагандыстаў – “толькі б не была вайны!”Вайна даўно вядзецца супраць свайго народу у якога атабралі свабодныя выбары, зрабілі закладнікамі кантрактнай сістэмы.

Для мяне ён прайграў, бо наша дзяржава не стала роднай для сваіх грамадзян. Вертыкаль стварыла сістэму скаржнікаў замест вольных грамадзян. Мы не маем права абраць сабе сваіх кіраўнікоў. За нас гэта вырашае вертыкаль. Вертыкаль толькі штотыднёва дае тэлефоны па якіх вы можаце скардзіцца камунальнікам, электрыкам, медыкам, ляснікам, газавікам і г.д.. “Прамая лінія” вядзе ў тупік грамадскай актыўнасці.

Для мяне ён прайграў, бо самыя актыўныя грамадзяне пакідаюць родную Беларусь. Кожны з нас мае родных, знаёмых, якія з’ехалі працаваць у Расію, або наогул пакінулі краіну, накіраваўшыся ў далёкае замежжа. І мы амаль не ведаем тых, хто прыехаў жыць да нас. У “квітнеючую і моцную” Беларусь. Я праўда ведаю адну жанчыну, якая пераехала на Гарадоччыну ў першыя гады яго кіравання, захапляючыся нашым першым кіраўніком. А зараз яе гаворка стала процілеглай.

Для мяне ён прайграў, бо яго курс вядзе ў мінулае. А словы аб мадэрнізацыі, іннавацыях, інвестыцыях так з большага і застануцца славамі. Як кажа мой адзін вядомы эксперт-эканаміст -- у краіне не выкапалі ні воднай ямы, ні пабудавалі ні воднага падмурка для сучаснага завода за увесь час яго кіравання.

Усё гэта дае поўнае права сказаць, што самым лепшым выйсці для Беларусі быў бы дабраахвотны зыход з улады яго. Таго, хто не выконвае свае абавязкі перад народам. Таго, хто адняў у народа яго неад’емнае права – выбіраць для сябе ўладу.

**Леанід Гаравы.**

# ЯКІЯ ГРОШЫ, ТАКОЕ І ЦЯПЛО

Вынікаючы народнай прымаўцы: “Рыхтуй санкі ўлетку, а калёсы ўзімку”, руплівыя гаспадары пачынаюць падрыхтоўку да зімы задоўга да першых халадоў. Спякотнае лета хутка мінае, а за ім неўзабаве – кастрычнік, пачатак ацяпляльнага сезону. Тым больш, што прырода ў апошнія гады прыносіць нечаканасці, і, сёлета можа здарыцца так, што і зіму давядзецца назваць па аналогіі з летам – анамальнай. А зіма найперш правярае на трываласць аб’екты народнагаспадарчага і жыллёвага комплексу. Варта адзначыць, што ў Шумілінскім раёне летась не было дапушчана сур’ёзных аварый, зрываў цепла- і электразабяспячэння. А планы на наступны ацяпляльны перыяд распрацаваныя: каб цеплавая энергія адпускалася згодна з тэмпературнымі графікамі, забяспечвалася рытмічная пастаўка паліва ў кацельні, спажыўцы нашага раёна бесперабойна атрымлівалі прыродны і звадкаваны газ. Магутнасцяў хопіць, каб спажыўцы атрымлівалі цяпло ў поўнай меры. Але ж на сённяшні дзень вельмі востра стаяць патрабанні па эканоміі паліва. Што робіцца ў раёне па эканоміі цяпла ў кватэрах нашых жыхароў? Важны чыннік – замена зношаных цеплавых сетак. На рамонт цепласетак у г.п. Шуміліна затрацілі 160 мільёнаў рублёў. Паступова вядзецца замена старых труб на сучасныя прадізаляваныя. Аднак яшчэ не завершаны работы на ўчастку ад дома № 2 да па вуліцы Шумілінскай, да дзяцячага садка № 1, у раёне будынка ваенкамата, міліцыі, дома № 2 па вуліцы Вакзальнай. Па ўсяму відаць, рамонт будзе скончаны толькі вясной. Як заверыў начальнік тэхнічнага аддзела камунгаса Ю. Міцькін, падстаў для хвалявання жыхарам дома № 2 няма. Калі яны самі не застануцца ўбаку ад падрыхтоўкі да маразоў – заклеюць усе вокны, уцепляць дзверы, дык холадна не будзе. Сітуацыю ўскладнілі падрадчыкі, якія не арганізавалі своечасовую пастаўку новых труб. Карацей кажучы, будуць грошы – будзе і цяпло.

**Я. Вайтовіч.**

# БЕЗ АДРЫВУ АД НАРОДА

Што так непакоіць жыхароў Шумілінշчыны, з якімі праблемамі яны вырашылі звярнуцца да кіраўніка раёна В. А. Падляшчука? Наўрад ці знойдзецца ў раёне чалавек, які дзякуючы толькі асабістаму старанню самастойна справіўся з усімі праблемамі будзённага жыцця. Менавіта таму ў якасці памочніка заўсёды павінна выступаць мясцовая ўлада.

8 снежня вельмі багатым быў на тэлефонныя званкі тэлефонны дыялог старшыні выканкама Вальдэмара Падляшчука з насельніцтвам нашага раёна. Падчас “прамой лініі” Вальдэмара Антонавіч адказаў на дваццаць два тэлефанаванні, прычым разнастайнасцю зместу пытанняў сустрэча не вызначалася. У значнай ступені наша жыццё вызначае быт, а таму калі ўзнікаюць бытавыя праблемы, мы адразу ж на іх адпаведна рэагуем. Вось і на гэты раз большасць зваротаў датычылі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. З розных населеных пунктаў пасыпаліся скаргі на няварашаныя камунальнай службай тэрміновыя работы. Сітуацыя аказалася настолькі бязвыхаднай, што начальнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна В. А. Коўзан па большасці пытанняў не змог апраўдацца перад кіраўніком раёна. І сапраўды, калі ў горпасёлку Обаль замерзлі тры калонкі, пенсіянеры засталіся без пітной вады, не будучь жа хворыя і састарэлыя людзі “адграваць” іх сваімі сіламі. На перабоі з вадой скардзіліся і жыхары з вёскі Язвіна. А што заставалася рабіць жыхарам дамоў № 6 і № 53 па вуліцы Юбілейнай, як не звярнуцца ў больш высокія кабінеты? Падвалы затапіла вадой, а мясцовыя камунальнікі працяглы час не звяртаюць на гэта ўвагі. Падставай для звароту да кіраўніка выканкама стала нізкая тэмпература ў кватэрах абальчан па вуліцы Даўмана ( дом № 23 ) і жыхароў райцэнтра па вуліцы Шумілінскай (дом № 2). Гэта пытанне, як кажуць “з барадой”. Кватэраздымшчыкі ўжо другі сезон запар абіваюць парогі розных начальнікаў, для таго, каб ім зрабілі пераразлік платы за ацяпленне. Трэба сказаць, што і кіраўнікі камунгаса не заўсёды маюць тэхнічныя магчымасці для своечасовага рамонту падведамасных аб’ектаў. Да таго ж часта падводзяць партнёры і падрадчыкі. Колькасць бюджэтных сродкаў, на жаль, не можа закрыць усіх неабходных дзірак “для латання”. І ў такой сітуацыі здзіўляюць просьбы некаторых грамадзян, якія карыстаюцца льготнымі паслугамі. Да прыкладу, інвалід з вёскі Андрэеўка І. Бадзяла прасіў дадатковы прычэп дроў. Льготныя пяць кубоў ён ужо атрымаў, але іх не хапіла. Старшыня Мішнявіцкага сельсавета А. Гаўрыленка растлумачыў, што па дзяржаўных нарматывах льготную драўніну інваліду прывязуць толькі ў наступным годзе, а цяпер трэба купляць па поўнай цане. Былі тэлефанаванні і больш жыццёва важныя. Паступіў калектыўны зварот ад жыхароў Полькавіч, яны патрабавалі аднавіць работу паштовага аддзялення. Не абыйшлося і без нязручных пытанняў. Адзін механізатар з вёскі Сураўні наракаў на нізкія заробкі жывёлаводаў. В. А. Падляшчук амаль паўгадзіны быў вымушаны даказваць калгасніку, што для таго, каб атрымліваць 500 абяцаных Лукашэнкам даляраў замест рэальных 500 тысячаў беларускіх рублёў трэба надаіць малака ў чатыры разы болей. Па ўсяму бачна, шэраг набалелых пытанняў кіраўніцтву раёна вырашыць не ўдалося. Тым не менш, прадстаўнік прэзідэнцкай вертыкалі ўзяў нявырашаныя праблемы пад строгі асабісты кантроль.

**Алесь Прыбярэжны.**




## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўлены грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**

**Шаноўны чытач! Адкажыце на пытанні (падкрэсліце варыянты адказа) і дашліце анкету на адрас рэдакцыі. Дзякуй!**

**Апытанне аб выданні**

**1. Як Вы ацэньваеце змест выдання?**

- выдатны
- добры
- здавальняючы
- нездавальняючы

**2. Як Вы ацэньваеце вёрстку выдання?**

- выдатная
- добрая
- здавальняючая
- нездавальняючая
- не ведаю

**3. Для мяне цікавы матэрыялы пра (укажыце тры пазіцыі):**

1. Дачу;
2. Здароўе
3. Спорт;
4. Выхаванне дзяцей;
5. Жанчын;
6. Узаемаадносіны;
7. Адукацыя;
8. Аўтамабілі;
9. Адпачынак;
10. іншае________________________

**4. У выданні мяне цікавіць: (укажыце тры пазіцыі, гл. на адвароце)**

# Аграгарадок – гіблае месца

Год таму ў вёсцы Амбросавічы ўзвялі аграгарадок. Звыш двух дзесяткаў семьяў калгаснікаў, у асноўным маладыя людзі, займелі магчымасць жыць у новых дамах прысядзібнага тыпу. Калгас “Баравінка” лічыцца не апошнім у раёне, яго старшыня Васіль Юхнавец займае пачэснае месца на раённай дошцы гонару. Зрэшты, і дзяржава аказвае гаспадарцы значную дапамогу. Сюды паступаюць новыя адзінкі тэхнікі, мінеральныя ўгнаенні, насенне, дызельнае паліва. Уладкавацца на працу можна кожнаму вяскоўцу, нават і тым, у каго няма адпаведнай спецыяльнасці, пры жаданні можна знайсці занятак. Канешне, заробкі ў калгаснікаў, мякка кажучы больш чым сціплыя ( кіраўніцтва ў гэты лік не ўваходзіць), але з большага яны задаволены і гэтай зарплатай – ніхто ж не пратэстуе. Здавалася б, чаго яшчэ трэба вясковым жыхарам для поўнага шчасця? Аднак на самай справе вясковую ідылію разбурае жорсткая рэчаіснасць. У пачатку снежня адзін 35 -гадовы мужчына не знайшоў паразумення з жонкай, застаўся адзін у доме і… палез у пятлю. Яго сусед, таксама малады мужчына дапамагаў яго хаваць – капаў нябожчыку яму на могілках. Апошні выпіў на хаўтурах, прыйшоў дадому, лёг у ложак з цыгарэтай і згарэў разам з новым домам. Дзве трагічныя, недарэчныя смерці ў адзін дзень. Людзі ў самым квітнеючым узросце, якім было ледзь за трыццаць. Увогуле, у вёсцы Амбросавічы за апошнія пяць год заўчасна развіталіся з жыццём каля дваццаці чалавек ва ўзросце ад 30 да 50 гадоў. І пачалося гэта выміранне не пяць годаў таму і не пятнаццаць, а цягнецца яшчэ з савецкіх часоў. Пасля цяжкай працы на сельгаспрадпрыемстве калгаснікі ідуць дамоў, а там пачынаецца другая праца – на асабістым падворку трэба дагледзець жывёлу, капацца ў агародзе. Няма калі ўдзяліць увагу сям’і, не кажучы ўжо пра вольны час. Так чалавек трапляе ў зачараванае кола. Газет вяскоўцы не чытаюць, яны дарагія, а па тэлевізару глядзець нечага, хіба што дэбільныя серыялы ды перадвыбарныя шоу нязменнага правадыра. Грамадскага жыцця няма наогул: ініцыятыва знізу жорстка падаўляецца – месца ў раёне не знойдзеш. Адзінае месца, куды цягнецца мясцовы люд – вясковая крама. Цягнуцца для таго, каб забыцца. Як ніколі добра дапамагае самаізалявацца сяльчанам ад праблем нашага грамадства цяперашняя ўлада. Сам кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка на гэтак званым Усебеларускім сходзе прызнаўся, што п’янства ў працоўных калектывах распаўсюджана па віне нядбайных кіраўнікоў. Праўда, пры гэтым прамаўчаў, што сам нічога не зрабіў для скарачэння вытворчасці танных алкагольных напояў. І паранейшаму вязуць у магазін аграгарадка Амбросавічы два разы на тыдзень сотні скрынак гарэлкі, піва і “чарніла”. А паслухмяны народ усё выпівае. У п’яным угары ўчыняюцца злачынствы, распадаюцца сем’і, застаюцца сіротамі дзеці, здараюцца няшчасныя выпадкі і самагубствы. Прынамсі, нямала ў аграгарадку і тых, якія вядуць здаровы лад жыцця. Але самыя актыўныя і кваліфікаваныя ўжо пабудавалі ў Шуміліне кааператыўны дом і збіраюць рэчы – рыхтуюцца да пераезду. Маладыя спецыялісты больш як два-тры гады на вёсцы не затрымліваюцца. Новыя дамы пусцеюць на некаторы час, а неўзабаве на месца ўцекачоў прыязджаюць новыя шукальнікі лепшага жыцця. Толькі ці шмат такіх, хто знайшоў тут долі лепшай?

**Аляксандр Шчамлёў.**

# Хто папоўніць рады “бамжоў”?

Галоўная задача камунальнікаў – стварыць найлепшыя ўмовы для жыцядзейнасці насельніцтва, максімальна задаволіць праблемы людзей. У сваю чаргу,кватэраздымшчыкі, згодна з дзеючым заканадаўствам, абавязаны ўносіць за гэта пэўную плату. Але факты – упартая рэч. На жаль, даволі значная частка жыхароў нашага раёна гэта палажэнне не выконваюць. Насельніцтва Шумілінскага раёна завінавацілася жылкамгасу 199 мільёнаў рублёў. Безумоўна, камунальнікі таксама не спяць у шапку, а пастаяна нагадваюць неплацельшчыкам аб неабходнасці выконваць свае грамадзянскія абавязкі. Апошнім часам з’яўляецца шмат паведамленняў, якія прымае адміністрацыя камунальных службаў да неплацельшчыкаў. Увогуле ўстаноўлена, што неплацельшчыкам лічыцца грамадзянін, які не ўнёс плату за камунальныя паслугі за мінулы месяц не пазней бягучага. Спачатку даўжнікам пасылаюць пісьмовыя папярэджанні, а калі гэта не дзейнічае, вывешваюць спісы нядбайных кватэраздымшчыкаў на інфармацыйным стэндзе, што насупраць будынка раённай міліцыі. Даецца тэрмін аплацiць запазычанасць. Хто часцей не плаціць за кватэру і камунальныя паслугі? У раённай управе існуе статыстыка пра неплацельшчыкаў і захадаў супраць іх. Ніхто не адмаўляе таго факта, што за кватэру не разлічваюцца асобы маламаёмныя. Заробкі ў райцэнтры сціплыя, а тым больш на вёсках далёка не дасягаюць і сярэдніх паказчыкаў па раёну. Вядома, што і камунальнікі ідуць на крайнія меры – зварот у суд не ад добрага жыцця. У гэтым годзе раённы суд разгледзеў 275 заяў аб прымусовым спагнанні камунальных плацяжоў. Адначасова ў камунгасе працуе тэхнічная брыгада, задача якой – адключэнне ацяплення, вады і каналізацыі ў дамах, дзе жывуць неплацельшчыкі. Сёлета ў Шуміліне засталіся без вады і цяпла. 76 сямей. Разам з тым ствараюцца дыскамфортныя ўмовы для існавання суседзяў. Уявіце сабе, што будзе, калі за вашай сцяной знаходзіцца халодная кватэра , без вады і электрычнасці? Бываюць выпадкі, калі ўсе ж даўжнікі знаходзяць сродкі, каб пагасіць запазычанасць, адна жанчына ўзяла крэдыт у банку на два мільёны рублёў. У іншых канфіскавалі маёмаць: у жыхаркі В. з вуліцы Зялёнай судовыя выканаўцы забралі DBD, а грамадзянка С. вымушана была аддаць за даўгі DBD, мікрахвалевую печ і тэлефонны апарат. Больш складанае пытанне – высяленне нядбайных грамадзян з жылога памяшкання. На тых кватэраздымшчыкаў, якія больш за паўгода не плацяць за жыллё і камунальныя паслугі збіраюць неабходныя дакументы. У крайнім выпадку, калі наймальнік вядзе антысацыяльны лад жыцця і пры гэтым псуе жыллё, ён можа быць выселены на вуліцу. Сям’ю К. з райцэнтра ўжо пазбавілі кватэры, у бліжэйшы час раённы суд задаволіць іскі па высяленні яшчэ 18 сем’яў. Такім чынам, колькасць бяздомных павялічвецца, а сацыяльнай падтрымкі з боку ўлады не амаль што не назіраецца. Пакуль што выселілі самых злосных неплацельшчыкаў, якія п’юць. Але хто ведае, ці трапяць ў рады “бамжоў” збяднелыя не па сваёй віне людзі, у якіх ледзьве хапае грошай на ежу, адзенне і лекі?

**Алесь Шумскі.**

1. матэрыял пра мясцовую ўладу;
2. матэрыял пра мясцовыя праблемы (камунальныя, дабраўпарадкавання, праца арганізацый);
3. матэрыял пра Віцебшчыну;
4. матэрыял пра падзеі ў краіне;
5. аналітычныя матэрыялы;
6. прыватныя абвесткі;
7. матэрыял пра землякоў;
8. вынікі інтэрнэт-апытання;

**5. Рэдакцыі трэба больш пісаць пра ( пазначце тры адказа):**

1. праблемы мясцовай ўлады;
2. мясцовыя праблемы жыхароў;
3. дасягненні ўладаў;
4. вядомых асоб раёна;
5. спартыўныя мерапрыемства;
6. гісторыю рэгіёна і краіны
7. пісаць пра____________________

**Паведаміце пра сябе:**

1. Пол: муж; жан. 2. Узрост да 20 гадоў; 20-35 гадоў; 36-55 (60); 55(60) і больш;

3. Адукацыя: сярэдняя; сярэдне-спецыяльная; незакончаная вышэйшая; вышэйшая.

4. Сацыяльны статус: бюджэтны работнік; працоўны; студэнт; прадпрымальнік; часова не працуе ( беспрацоўны), пенсіянер.

Анкету дасылайце ў рэдакцыю. Даслаўшыя некалькі анкет атрымаюць сувеніры.

# ЗБАНКРУТАВАНЫЯ СПОНСАРЫ

Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка любіць паўтараць, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для “шчаслівага жыцця і творчага развіцця дзяцей”. Безумоўна, для дзяцей узводзяцца лядовыя палацы, водныя басейны, велатрэкі, гарналыжныя комплексы. Але гэтыя сацыяльныя даброты больш даступныя тым дзецям, які пражываюць у сталіцы або ў абласных гарадах. Зразумела, што ў нашым раёне магчымасці для дабрачыннасці значна абмежаваныя, але ўсё ж нешта робіцца. Па меры развіцца камп’ютарных тэхналогій нашы дзеці павінны мець больш шырокія магчымасці для атрымання ведаў. А для гэтага патрэбна сучаснае камп’ютарнае абсталяванне. Каб не былі абдзелены сельскія школы, у якасці спонсара выступіў шумілінскі філіял “Белаграпрамбанка”. Нядаўна банкаўскія служачыя наведалі Башнеўскую школу. Шумілінскія касіры на чале з кіраўніком разлікова-касавага цэнтра Д. Буднікам прывезлі школьнікам тры камп’ютары, два прынтары, блакноты, ручкі і флікеры. На ўрачыстую лінейку сабралася ўсе вучні і настаўнікі, яны не хавалі сваёй радасці – такія падарункі прывозяць не кожны дзень. Дырэктар школы В. Зянькоў у сваю чаргу выказаў падзяку прадстаўнікам банкаўскага аддзялення і расказаў аб поспехах школьнікаў. Пасля ўрачыстасцяў адбылася шчырая размова. Настаўнікі і дзеці задавалі пытанні, а работнікі банка растлумачылі прысутным аб умовах атрымання крэдытаў. Цяпер у сельскіх школьнікаў будзе магчымасць на новых камп’ютарах выходзіць у Інтэрнет. А самыя дасведчаныя з іх змогуць даведацца з сайтаў незалежных газет, што “Белаграпрамбанк” на сённяшні дзень – самы праблемны банк. Насамрэч банк мала чым адрозніваецца ад ляжачага калгаса “Баравінка”, дзе працуюць іх бацькі. І для таго, каб утрымаць на нагах сельскую гаспадарку, загадам кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі “Белаграпрамбанку” выдзелілі за кошт сродкаў бюджэту фінансавую дапамогу ў памеры 1,5 млрд. даляраў. Як бачым, нашы спонсары самі сядзяць на датацыях за кошт падаткаплацельшчыкаў.

**С. Горкі.**

# ДАЎГІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ РАСТУЦЬ

Сёлета ў Шумілінскім раёне праглядаецца адмоўная тэндэнцыя па напаўненні плацяжамі бюджэту Фонду сацыяльнай абароны. На першае лістапада ў Фонд паступіла 14 мільярдаў рублёў. За гэтай лічбай стаяць у асноўным буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы раёна. Разам з тым пратэрмінаваная запазычанасць па плацяжах у Фонд суб’ектаў гаспадарання вырасла ў параўнанні з мінулым годам на 17,4 % і саставіла 10,8 мільярдаў рублёў. Амаль уся запазычанасць дапушчана сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі. У тройку лідэраў трапілі “Шумілінскі райаграсервіс” (41,8%), саўгас “Лаўжанскі” (12,7%) і саўгас “Сіроцінскі” (7,9%). Самую значную суму грошай (702,6 млн рублёў) недаперальічыў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва “Шумілінскі райаграсервіс”. Трэба адзначыць, што для забяспячэння своечасовага паступлення абавязковых пляцяжоў гаспадаркам была аказана падтрымка. Аднак дагэтуль ніводнае сельгаспрадпрыемства не забяспечыла стопрацэнтнае паступленне плацяжоў. Наступны крок – прымусовае спагнанне запазычанасці з неплацельшчыкаў.

**Я. Вайтовіч.**

# ПОГЛЯД ПАДЛЕТКАЎ НА ПРАБЛЕМУ СНІДУ

Па традыцыі, якая склалася даўно, у школах шумілінскага раёна прапагандавалі здаровы лад жыцця. Па ініцыятыве настаўнікаў у СШ № 1 адбылася акцыя пад назвай “Скажам СНІДу рашучае “Не”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшакласнікі, для якіх была арганізавана віктарына. У спаборніцтве двух каманд выявіліся найбольш падрыхтаваныя школьнікі, хаця пытанні былі нескладаныя. Асаблівым зместам быў напоўнены відэаролік, з якога падлеткі даведаліся пра непазбежныя наступствы страшнай хваробы. СНІД – хвароба невылечная, таму і тэматыка выставы была знакавай. “Выберы свой шлях”, “Не аступіся” – самі назвы ўжо папярэджваюць вучняў пра пагрозу небяспечных паводзінаў. Мерапрыемствы, прысвечаныя Сусветнаму Дню прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі праходзілі ў школе цэлы тыдзень. Старшакласнікі ладзілі выставы, чыталі вершы, праводзілі трэнінгі. Бадай што самым запамінальным стаў тэматычны вечар у гарадскім Доме культуры, на сцэне якога адбылося цікавае прадстаўленне. І, трэба спадзявацца, гэтыя акцыі прымусілі шумілінскіх маладзёнаў задумацца аб сваёй будучыні, не патрапіць у лік тых, хто ў выніку разбэшчанасці асудзіў сябе на добраахвотнае выміранне.

**С. Горкі.**

# ВУЧОБА КІРАЎНІЦТВА ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

У форме делавой гульні праходзіла вучоба кіраўнічага ядра выбарчых камісій у Шумілінскім раёне. На базе ўчастка для галасавання № 3 (адміністратыўны будынак ПМК-70) праводзіўся трэнінг старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў участковых камісій. Перад удзельнікамі трэнінга выступіў намеснік старшыні райвыканкама А. М. Зайцаў, які нагадаў кіраўнічаму складу ўчастковых камісій аб дасканалым выкананні заканадаўства пры правядзенні прэзідэнцкіх выбараў. Як працаваць на датэрміновым галасаванні, галасаванні на даму, весці працэдуру падліку галасоў вучыла галоўны кадравік райвыканкама Н. У. Захарава. За трэнінгам назірала старшыня райсавета Ірына Новікава. А нашы шумілінскія выбаршчыкі ўсё яшчэ спадзяюцца, што выбары будуць праведзены дэмакратычныя, свабодныя, празрыстыя і справядлівыя.

**Алесь Прыбярэжны.**

# Колькі нам каштуе прэзідэнт? $400 мільёнаў у год!



## *Кіраўніцтва справаў, Служба бяспекі, Рэзервовы фонд. «Наша Ніва» падлічыла афіцыйны бюджэт розных прэзідэнцкіх структур.*

**Выдаткі на дзяржаўныя органы, якія забяспечваюць дзейнасць прэзідэнта, мільярдаў рублёў**

(у дужках — эквівалент у далярах)
2011 — 41,1 ($13 млн)
2010 — 30 ($10 млн)
2009 — 34,4 ($12 млн)
2008 — 26,4 ($12 млн)
2007 — 26,6 ($12 млн)

* * *

**Адлічэнні з бюджэту ў рэзервовы прэзідэнцкі фонд, мільярдаў рублёў**

(у дужках — эквівалент у далярах)
2011 — 270 ($90 млн)
2010 — 2760 ($919 млн)
2009 — 324 ($114 млн)
2008 — 217 ($99 млн)
2007 — 176 ($80 млн)

* * *

**Адлічэнні на дзейнасць Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, мільярдаў рублёў**

(у дужках — эквівалент у далярах)
2011 — 405 ($128 млн)
2010 — 245 ($82 млн)
2009 — 284 ($100 млн)
2008 — 178 ($81 млн)
2007 — 133 ($61 млн)

* * *

Афіцыйныя даходы кіраўніка дзяржавы становяцца вядомыя беларусам толькі калі трапляюць у дэкларацыі аб даходах кандыдатаў у прэзідэнты. Папярэдні раз такая інфармацыя была ў 2005 годзе. Тады кіраўнік дзяржавы зарабіў за год 59 мільёнаў рублёў. У эквіваленце гэта складала каля 20 тысяч еўра.

Цяпер Лукашэнка зарабляе 94,5 мільёна рублёў — каля 24 тысяч еўра.

Але выдаткі краіны на прэзідэнта — гэта не толькі ягоны афіцыйны заробак.

Абслугоўванне прэзідэнта вымагае шмат дадатковых стратаў, і некаторыя з іх прапісваюцца ў бюджэце. Якія менавіта?

Першым радком у раздзеле «Агульнадзяржаўная дзейнасць» бюджэту краіны ідуць выдаткі на «дзяржаўныя органы, якія забяспечваюць дзейнасць прэзідэнта». З года ў год гэтая лічба вагаецца ў раёне $12 мільёнаў. Выключэннемрэкардсменам стане толькі наступны год. Дзейнасць прэзідэнта «падаражае» ажно на 37% у параўнанні з леташнім паказчыкам. У сярэднім, усе працаздольныя беларусы вымушаны «скідвацца» па $2.

### Загадкавы фонд

Адлічэнні ў загадкавы Рэзервовы фонд прэзідэнта нашмат большыя.

У гэтым годзе кожны працаздольны беларус падзяліўся з кіраўніком дзяржавы заробленымі $156.

Незразумелы статус грошай дае глебу для спекуляцый.

Вядома, што існуюць два іншыя фонды — для дапамогі юрасобам і індывідуальным прадпрымальнікам і для фінансавання расходаў, звязаных са стыхійнымі бедствамі і катастрофамі. Што датычыць прэзідэнцкага фонду, то тут грошы ідуць на падтрымку таленавітай моладзі — выплату павышаных стыпендый, арганізацыю адукацыйных і забаўляльных мерапрыемстваў.

«Існаванне прэзідэнцкага фонду, які напаўняецца з бюджэту, а ягоныя грошы размяркоўваюцца прэзідэнтам, — гэта агульная практыка. Такія фонды існуюць у многіх краінах. Напрыклад, у Казахстане 300 студэнтаў атрымліваюць грошы з рук Назарбаева. Усё адно, ці будуць сродкі ісці напрасткі з бюджэту, ці выдавацца з рук прэзідэнта. Іншае пытанне, што ўсе ведаюць пра існаванне прэзідэнцкага фонду, але калі там была апошняя рэвізія і ці былі яны ўвогуле — ніхто не ведае», — кажа незалежны эканаміст Леанід Злотнікаў.

Колькі нам каштуе прэзідэнт? Дадамо, фінансаванне будоўляў, прэмій і стыпендый з прэзідэнцкага фонду актыўна выкарыстоўваецца ў прапагандзе. Так, нібы гэта не грамадства фінансуе, а асабіста палітык Аляксандр Лукашэнка.

Звычайна адлічэнні з бюджэту складаюць каля $100 мільёнаў штогод. Выключэннем стаў гэты год, калі ў выніку пераразмеркавання бюджэту выдаткі на рэзервовы фонд перавысілі $900 мільёнаў!

Нягледзячы на дэфіцыт бюджэту, кіраўнік дзяржавы вырашыў не змяншаць выдаткі на сацыяльная праграмы, даплаціўшы з «уласнай» кішэні. Вось толькі гэтыя грошы былі кампенсаваныя да канца года. Агульная сума, што ўтрымліваецца ў рэзервовым фондзе прэзідэнта, невядомая. Па ўскосных сведчаннях, у сярэдзіне года яна складала каля $2,8 мільярда.

### Прэзідэнцкія заўхозы

Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, у адрозненне ад рэзервавага фонду, не «пазычае» грошай дзяржаўнаму бюджэту. Таму сярэднія выдаткі на гэтую ўстанову складалі за апошнюю пяцігодку «ўсяго» $90 мільёнаў.

Выхад з крызіснага 2010 года прадугледжвае, што выдаткі на імперыю прэзідэнцкіх заўхозаў узрастуць больш чым на палову — да $128 мільёнаў. Варта адразу ўдакладніць, што прыведзеныя выдаткі ніяк не пераклікаюцца з забеспячэннем дзейнасці прэзідэнта, бо праходзяць па рознай ведамаснай класіфікацыі.

Кіраўніцтва — гэта камерцыйная структура. І няясна, чаму кожны з нас вымушаны як шчодра фінансаваць з уласнай кішэні.

### Бяспека даражэйшая за дзейнасць

Яшчэ некалькі установ маюць да кіраўніка краіны ўскоснае дачыненне. Яднае іх яшчэ адзін факт — усе яны ў 2011 годзе істотна падаражаюць. Напрыклад, Акадэмія кіравання каштавала сёлета $3 мільёны, а ў наступным годзе пацягне на ўсе $3,8 мільёна.

Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце падрасце з $4,2 мільёна да $5,4 мільёна.

Трэцяя арганізацыя, Служба бяспекі прэзідэнта, замахваецца на лічбы іншага кшталту. У гэтым годзе яна каштавала амаль столькі ж, колькі «забеспячэнне дзейнасці» кіраўніка дзяржавы — $10,2 мільёна.

А вось у наступным вырасце больш чым напалову — аж да $15,7 мільёна! Варта ўдакладніць, што ўсе дадзеныя за 2011 год пералічаныя па курсе 3170 рублёў. Зробім выгляд, што верым лічбам, закладзеным у бюджэце.

Калі падлічыць, колькі бюджэтных грошаў давялося выдаткаваць на дзейнасць прэзідэнта, службу ягонай бяспекі, кіраўніцтва справамі і рэзервовы фонд, за пяць гадоў атрымаецца $1,9 мільярда! У сярэднім — $400 мільёнаў штогод. Сапраўды, прэзідэнт — дарагая забаўка.

**Віталь Несцераў.**

# РЕЦЕПТ ЛАПШИ НА УШИ ИЗБИРАТЕЛЕЙ



Максимум патетики, минимум конкретики – по такому принципу построена предвыборная программа Александра Лукашенко образца 2010 года. В этом документе «Салідарнасць» обнаружила несколько нехитрых приемов, при помощи которых избирателям пудрят мозги.

Прежде всего, в предвыборной программе Александра Лукашенко активно **используется принцип: «Все новое – это хорошо забытое старое».** Возьмем, к примеру, вот такой пункт: **«К 2015 году уровень жизни в Беларуси приблизится к европейскому».** Звучит красиво, но…

То же самое было обещано и на предыдущих выборах. Цитата из программы Лукашенко образца **2006 года: «Основная задача на ближайшие пять лет – довести качество жизни наших граждан до уровня, сравнимого с западноевропейским».**

И – вы будете смеяться – на позапрошлых выборах звучало еще более сладкое обещание. **В программе 2001 года Лукашенко амбициозно заявлял о «резком повышении благосостояния народа и приближении его к уровню экономически развитых европейских государств».**

**Вспоминается нетленное: «Наша цель – коммунизм!».** И результат примерно такой же. Достаточно упомянуть, что ныне средняя зарплата в Польше составляет около 1500 долларов, у нас – пока не дотягивает и до обещанных 500 (при том, что в соседней стране многие товары и услуги дешевле, чем у нас, хотя, разумеется, есть и обратные примеры). Нечего сказать – приблизились!

**Еще одна стандартная «фишка» - обещание квартир многодетным семьям.** В 2006 году оно звучало так: **«Наш ориентир: каждой молодой семье — квартиру не позднее чем через 3 года после вступления в брак. А многодетным семьям государство ее оплатит: при наличии пятерых детей — 100 процентов, четырех — 50 процентов, троих — 30 процентов».**

Нынешний вариант еще краше: **«Каждая семья, где есть четверо и более детей, за счет государства получит квартиру. Семьям с тремя детьми будут компенсированы 75 процентов стоимости жилья».** И фигня, что обещание пятилетней давности провалено! Зато перспективы стали о-го-го!

Такого рода примеров можно привести довольно много. Но перейдем к следующему способу вешания лапши на уши избирателям.

В разделе «Что мы сделали» нынешней программы Лукашенко, в частности, говорится: «По уровню развития человеческого потенциала **Беларусь заняла 61-е место из почти двух сотен стран мира.** Для молодого суверенного государства, которому не исполнилось и двадцати лет, - это почетное место!»

Все бы ничего, но **в 2003 году Беларусь в этом рейтинге занимала 53-е место.** Таким образом, за последние годы наша страна здесь не приобрела, а утратила. Но об этом авторы программы скромно умолчали, рассчитывая, что избиратели не станут рыться в архивах, чтобы сравнить нынешнее положение с прошлым.

**Наконец, из нынешней программы по сравнению с предыдущими изъят ряд конкретных ориентиров. Они заменены на патетические обещания: «усилим», «укрепим», «расширим» и т.д.**

Пример: в программе Лукашенко 2006 года говорилось, что инфляция будет снижена до уровня **не более 5% в год. На самом деле, по итогам текущего года она составит около 10%.** Судя по всему, обуздать рост цен нынешний глава Беларуси в случае переизбрания не рассчитывает. Поэтому в нынешней его программе инфляция вообще не упоминается. Нет такой проблемы!

Оценить исполнение некоторых ранее данных обещаний читатели могут самостоятельно:

-- Учитель, врач, ученый будут получать зарплату в 1,2 - 1,5 раза выше средней. (2001 год)

-- Либерализация экономики, стимулирование предпринимательской активности человека. Число лицензируемых видов деятельности будет сокращено до 10 - 12. (2001)

-- Мы сделаем жизнь в сельской местности не менее комфортной, чем в городах. (2006)

-- Мы вывели на мировой уровень сотни крупных производств. Теперь ПЕРВОСТЕПЕННАЯ задача — дойти до КАЖДОГО предприятия нашей страны, независимо от отрасли, сферы и численности работающих. (2006)

-- В ближайшее время мы получим право разработки месторождений нефти и газа на территории братской России. Тем самым будет ликвидирована зависимость государства от других стран в энергоресурсах. (2001)

-- Дальнейшее строительство Союзного государства является стратегической задачей, а братская Россия — важнейшим нашим партнером. (2006)

-- Мы добьемся того, чтобы человек перед лицом государственных служб перестал чувствовать себя просителем. (2006)

-- Во ВСЕХ (здесь и далее выделено автором статьи – прим.ред.) инстанциях будет внедрен принцип «одного окна». (2006)

-- Первостепенная задача — ОКОНЧАТЕЛЬНО ИСКОРЕНИТЬ волокиту, невнимательное отношение и формализм при рассмотрении насущных проблем людей. (2006)

Ну и так далее. В целом же трудно не согласиться с экономистом Леонидом Заико, который в эфире Радыё Свабода заявил: **«Если суммировать мои впечатления – это не программа, а агитка. Майские призывы ЦК ВКП(б) в 1956 году.** Я помню то время – это очень похоже. Только появились новые термины – нанотехнологии, интернет – а так всё то же самое».

**Вадим Ливнев.**

# Праваабаронцы зьбіраюць подпісы за суд над Лукашэнкам

## ІНІЦЫЯТЫВА БЫЛОГА СУДЗЬДЗІ ГАРЫ ПАГАНЯЙЛЫ ПРЫЦЯГНУЦЬ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКУ ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ПАВОДЛЕ АБВІНАВАЧАНЬНЯ Ў ЗАХОПЕ ЎЛАДЫ АТРЫМАЛА ПАДТРЫМКУ СЯРОД ПРАВААБАРОНЦАЎ, ЯКІЯ ЗЬБІРАЮЦЬ НА ВУЛІЦАХ МЕНСКУ ПОДПІСЫ ПАД ГЭТЫМ ПАТРАБАВАНЬНЕМ.

Ініцыятыву Гары Паганяйлы падтрымала праваабаронца Кацярына Садоўская. У 2007-м жанчына адбыла ў Гомельскай жаночай калёніі год паводле абвінавачаньня ў паклёпе на прадстаўнікоў улады. Ужо некалькі тыдняў праваабаронца зьбірае подпісы за суд над Лукашэнкам. Кацярына Садоўская кажа, што сабрала ўжо болей за сто подпісаў, і што людзі падпісваюцца ахвотна.

«Некаторыя падпісваюцца зь вялікім задавальненьнем. Нават гэта дэманструюць, што, маўляў, мы цябе не баімся. Што мы патрабуем і будзем патрабаваць, каб ты атрымаў тое, чаго заслугоўваеш. Так і кажуць: не баюся яго, як бы ён не пагражаў».

Акрамя прыцягненьня да суду Аляксандра Лукашэнкі, праваабаронцы патрабуюць зьняць яго з выбараў прэзыдэнта. Асноўны аргумэнт — што ён, як яны лічаць, у 1996-м годзе незаконна захапіў уладу. Таксама праваабаронцы мяркуюць, што дзейны кіраўнік Беларусі ня можа выконваць абавязкі прэзыдэнта паводле стану здароўя.

Як кажа Кацярына Садоўская, сабраныя подпісы будуць накіраваныя ў Нацыянальны сход, Вярхоўны і Канстытуцыйны суд, Пракуратуру Беларусі, у Цэнтравыбаркам, а таксама ў прадстаўніцтвы міжнародных арганізацый у Менску і міжнародным назіральнікам за выбарамі.

Ініцыятар прыцягненьня Аляксандра Лукашэнкі да крымінальнай адказнасьці былы судзьдзя Гары Паганяйла мяркуе: ягоная ініцыятыва падтрыманая, паколькі яна «цалкам заснаваная на законе». Чаму не адрэагавалі на заклік былога судзьдзі дзяржаўныя органы, якія сочаць за выкананьнем законаў?

«Таму што насамрэч у краіне ня дзейнічае прынцып падзелу ўлады, ня маецца ніякай супрацьвагі ўладзе аднаго чалавека. Прынцыпы законнасьці і парлямэнтарызму не выконваюць. Судовая ўлада цалкам падпарадкаваная прэзыдэнцкай уладзе, і таму не даводзіцца спадзявацца, што нехта прыме канстытуцыйныя захады і выканае тое, што прадугледжвае Канстытуцыя».

Кацярына Садоўская з аднадумцамі зьбірае подпісы за прыцягненьне да суду Аляксандра Лукашэнкі ў асноўным на выбарчых пікетах і падчас перадвыбарчых мітынгаў. Ці не перашкаджае міліцыя?

«Ніхто і нічога не перашкаджае. Міліцыянты баяцца падыходзіць да гэтых пікетаў, на якіх мы зьбіраем подпісы», — кажа Кацярына Садоўская.

**Алег Грузьдзіловіч.**

# ПАЭТ ЛУКАШЭНКА



**Пры адкрыцьці Ўсебеларускага сходу Аляксандар Лукашэнка вітаў яго ўдзельнікаў ад імя беларускага народу. Каго ж тады прадстаўлялі яны? Але гэта не адзіная і не галоўная паэтычная вольнасьць маратону ля мікрафону.**

Прамова не гучала як перадвыбарчая – проста нязьменны правадыр ставіў задачы і даваў абяцаньні.

Аднак выбарчы кантэкст прарываўся, калі прамоўца, не называючы імёнаў, адказваў сваім апанэнтам-канкурэнтам. Але пры гэтым многія ягоныя закіды насамрэч можа было закінуць і самому прамоўцу.

Ужо зараз відавочна, што абвінавачваньне апазыцыйных кандыдатаў у папулізьме стане хіба не галоўнай лініяй контратакі. Лукашэнка красамоўна распавядаў пра бездапаможнасьць апанэнтаў у адказах на пытаньне, дзе ўзяць грошы на іх шчодрыя абяцаньні.

Справа ня ў тым нават, што ў 1994 годзе на пытаньне прэм'ера Кебіча, як ён зьбіраецца запусьціць заводы, кандыдат у прэзыдэнты Лукашэнка адказваў: "Я ведаю як". Бо і зь сёньняшняй прамовы было незразумелым, як будуць дасягнутыя мэты, пастаўленыя ім. Адкуль возьмуцца грошы на мадэрнізацыю, на перабудову нацыянальнай эканомікі?

Навідавоку была супярэчнасьць паміж базавым тэкстам урадавай праграмы, на якой грунтаваўся дакладчык, і яго асабістымі эмацыйнымі "адрывамі" ад тэксту.

У гэтых "адрывах" прадпрымальніцтва трактавалася не як рухавік, не як мэханізм зьмены эканомікі, а як досыць экзатычная, у чымсьці нават карысная зьява, якую дзяржава па сваёй дабрыні не зьбіраецца нішчыць. Лукашэнка з гонарам казаў пра тое, што сустракаецца з кожным замежным бізнэсоўцам, які мае намер укладаць грошы ў беларускую эканоміку. Але гэта наўрад ці сумяшчальна з шырокім патокам замежных інвэстыцыяў.

Гэтак жа трактавалася і прыватызацыя – не як інструмэнт зьмены прыроды нацыянальнай эканомікі, а як нешта, што можна рабіць, а можна і не рабіць, што трэба абстаўляць шматлікімі ўмовамі і разглядаць кожны выпадак асобна і грунтоўна.

Пра што Лукашэнка казаў шчыра і ад душы – дык гэта пра дысцыпліну і парадак, якія могуць на 20% падвысіць эфэктыўнасьць вытворчасьці. Падыход цалкам натуральны ў межах створанай у Беларусі мадэлі. Але тады застаецца незразумелым, за кошт чаго і ў якім накірунку яе трэба мяняць.

Значная і хіба ня самая важная частка прамовы была прысьвечаная беларуска-расейскім адносінам. На адрас Расеі была пушчаная чарговая порцыя крытычных стрэлаў, Лукашэнка не хаваў крыўды на тое, што ў пасланьні фэдэральнаму сходу прэзыдэнт Мядзьведзеў нават не ўзгадаў Беларусь, але патас палягаў у тым, што з Расеяй усё ў Беларусі будзе добра, усё наладзіцца, што ніякага разрыву няма. Гэтыя супакойваньні прамоўца факусавана адрасаваў залі, якая глядзела «Хроснага бацьку» і чула крамлёўскія папярэджаньні. Гледзячы па ўсім, менавіта гэты разрыў з Крамлём, ці ягоны вобраз, ствараюць вялікую небясьпеку для прамоўцы.

У гэтым сьвятле нават камічна гучалі словы пра тое, што на саміце АБСЭ ў Астане ўсе ўбачылі, як супольна трымаюцца Беларусь і Расея. Здавалася б, усе ўбачылі, што расейскі лідэр ухіліўся ад камунікацыі са сваім беларускім калегам. Але чаго ня скажаш у паэтычным натхненьні!

Пры гэтым рабіліся празрыстыя намёкі на тое, што калі Расея будзе ўпарціцца, то "Беларусь не застанецца бясхознай", гэта "ласы кавалак для ЭЗ і ЗША". Такое ўсьведамленьне пра ўласную краіну ня надта стасавалася з годным заклікам "пазбаўляцца ад лёкайскай псыхалёгіі", але ізноў жа – хто ж патрабуе ад паэзіі лягічнасьці?

Цікавым быў фрагмэнт пра апору на ўласныя рэсурсы. Гэта – ускоснае сьведчаньне таго, што стасункі з Расеяй усё ж наўрад ці вернуцца на ранейшы ўзровень, калі ўсе патрэбы расейскімі рэсурсамі і забясьпечваліся.

Яркім момантам быў зварот да апазыцыйных кандыдатаў: "Можаце выводзіць людзей на плошчу, краіну вы не атрымаеце, мы не дадзім вам яе разьдзерці, яна нам дорага каштавала". "Мы" – гэта хто? Адзін з кандыдатаў у прэзыдэнты – іншым?

Прамовы Лукашэнкі падчас мінулых выбараў пакідалі ўсё ж больш цэласнае ўражаньне. Тады была пэўная яснасьць: ідзем наперад правільным шляхам, беларускі цуд бездакорны, будзем працаваць і ўсё атрымаецца, а падступнаму Захаду і ўнутраным ворагам дамо рады.

Цяпер і сам Лукашэнка ўсьведамляе, што нешта трэба мяняць. А вось як? Ці то рыфмы скончыліся, ці то адказы састарэлі, толькі адзінадушныя аплядысмэнты засталіся нязьменнымі.

Пакуль. **Юры Дракахруст.**

# «ЗАСУНУЛІ ПІСТАЛЕТ Ў РОТ, КРЫЧАЛІ ПРЫЗНАВАЦЦА...»

З трох падлеткаў, падазраваных па справе аб гучным забойстве ў Віцебску, выбівалі паказанні.

Магілёўскі абласны суд 29 лістапада прызнаў невінаватымі дваіх непаўнагадовых віцяблянаў — Аляксандра Логінава і Аляксандра Напаюка, абвінавачваных у забойстве, здзейсненым з асаблівай жорсткасцю групай асоб (па пп. 6; 15, ч.II, арт. 139 КК. РБ), у чэрвені 2009 года ў Віцебску. Пасля абвяшчэння прысуду абвінавачаныя былі вызваленыя з-пад варты ў зале судовага пасяджэння. За кратамі яны правялі амаль паўтара года — 10 месяцаў цягнулася следства і 7 — судовыя пасяджэнні.

Зверскае забойства (пацярпелы памёр ад 63-х нажавых раненняў і шматлікіх удараў) 31-гадовага беспрацоўнага было здзейснена 14 чэрвеня 2009 г. недалёка ад абласной бальніцы ў Віцебску.

У аператыўных работнікаў Першамайскага РАУС зачэпак не было, затое на носе быў чарговы «Славянскі базар» з абавязковым наведваннем горада прэзідэнтам. А чуткі пра крывавае злачынства ўжо распаўзаюцца па абласным цэнтры. Супакоіць народ можна было гучнай заявай аб затрыманні злачынца. І тут пад руку мясцовым Шэрлакам трапіліся трое дзевяцікласнікаў віцебскай гімназіі № 7 — Логінаў, Напаюк і Аўчароў. Яны прыйшлі на наступны дзень пасля забойства (яшчэ не ведалі пра злачынства) на тое самае месца ля пажарнага вадаёма за абласной бальніцай адзначыць сканчэнне навучальнага года.

Усё як у танным дэтэктыве: забойцы, маўляў, вяртаюцца на месца крывавай разборкі (на наступны дзень!). Акрамя таго, на думку операў, гімназісты павінны былі стаць «зручным матэрыялам» для абвінавачвання, бо ўсе трое — з няпоўных сем'яў. Іх выхоўвалі маці-адзіночкі, а Аляксандра Напаюка — і ўвогуле адна бабуля. Следства, мабыць, ніяк не разлічвала на супраціў...

Праз два тыдні школьнікі былі арыштаваныя. Прычым следства адразу пайшло па шляху найменшага супраціву — запалохвання сведак і падазраваных, фальсіфікацыі фактаў, прымянення фізічнага і псіхалагічнага гвалту ў адносінах да непаўналетніх з мэтай дачы хлусліівых паказанняў. А ў наступным (калі стала зразумела, што зрабіць з невінаватых вінаватымі будзе не так проста) — і шляхам зацягвання часу. Спіс парушэнняў заканадаўства, дапушчаных следчымі органамі, адвакат зачытвала ў судзе больш за гадзіну (сярод іх і парушэнне права на абарону ад першага дня затрымання). А аповед абвінавачаных аб катаваннях, якія ўжываліся ў адносінах да іх у Першамайскім РАУС, нельга было слухаць без унутранага ўздрыгу.

З аповеда Аляксандра Логінава: «Завялі ў кабінет № 19 (там ёсць шторы), было пяць чалавек, зачынілі дзверы на ключ (або зашчапку), спачатку паклалі на падлогу, адзін з іх, які пры затрыманні вёў машыну, дастаў пісталет, прыставіў да ілба, засунулі пісталет ў рот, крычалі, каб прызнаваўся. Потым паднялі з падлогі, паклалі на стол жыватом уніз, адзін узяў адкрутку і пачаў круціць перад вачыма са словамі: «Зараз засуну, куды трэба». Затым пасадзілі на крэсла, сталі біць па галаве далонямі. Усё гэта суправаджалася патрабаваннямі прызнацца... Пасля гэтага пратрымалі ў боксе каля 2 гадзін, затым у кабінеце кагосьці з кіраўніцтва было сказана: «Зараз завязем на Дзвіну, возьмем за ногі і патрымаем у вадзе».

16-гадоваму Аляксандру Аўчарову пасля допытаў у РАУС давялося рабіць сур'ёзную аперацыю на селязёнцы. Цалкам магчыма, што менавіта таму Аўчароў далей не фігураваў у крымінальнай справе. Супрацоўнікі міліцыі спалохаліся?

Як бы там ні было, але двое з трох хлапчукоў падпісалі пад катаваннямі яўку з павіннай. Тут, акрамя фізічнага прымусу, сваю ролю адыграў і псіхалагічны ціск.

Кожнаму з іх казалі, што двое яго сяброў ўжо далі паказанні супраць яго і адпушчаныя дадому.

У выніку не абгаварыў сябе толькі адзін з падазраваных (Аляксандр Логінаў).

Цікава, што ў якасці асноўнага сведкі выступала неаднаразова судзімая 15-гадовая (!) жыхарка Віцебска, што трапілася напярэдадні дня забойства на крадзяжы кашалька і праходзіла раней па гэтай жа справе ў якасці падазраванай. Бацькі затрыманых ўпэўненыя, што сведка была падкупленая супрацоўнікамі міліцыі і пайшла на ілжэсведчаньне, каб пазбегнуць пакарання за чарговы крадзеж.

У ходзе следства яна мяняла свае паказанні шэсць разоў (падлічана адвакатамі), няправільна паказваючы часам нават месца забойства (не кажучы аб удзельніках). У далейшым у справе з'яўляліся і схаваныя сведкі, у ролі якіх выступалі альбо былыя, альбо сапраўдныя зэкі, якіх падсаджвалі ў камеры да абвінавачваных ужо ў Мінску (калі справа пачала «гарэць», яе перадалі ў рэспубліканскую пракуратуру, сьледчаму Шчацько).

У той жа час, як паказалі адвакаты, шматлікія сведкі абароны дапытаныя не былі або іх паказанні проста не прымаліся пад увагу. Як зрэшты і аб'ектыўнае алібі: раздрукоўкі тэлефонных званкоў паказвалі на тое, што абвінавачаныя не маглі знаходзіцца падчас забойства ў раёне абланой бальніцы, а адзін з іх, Аляксандр Напаюк (дарэчы, грамадзянін Расіі), і зусім знаходзіўся на лецішчы за горадам. Але следства гэта ані не збянтэжыла.

Момант забойства быў адсунуты на часавы адрэзак, не забяспечаны алібі (час забойства ў ходзе папярэдняга следства змяняўся некалькі разоў). Усё на свае месцы паставіла толькі паўторная судмедэкспертыза, зладжаная ўжо на запыт суддзі. 4 лютага следчы Шчацько вынес пастанову аб прызначэнні псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы для А. Логінава. Як сцвярджае яго бацька Хачатур Хачатуран, асабістую справу сына перадалі ў Навінкі толькі праз 22 дні, а амбулаторная карта з Віцебскага ПНД з'явілася яшчэ праз тыдзень. Хачатур Хачатуран дамогся і асабістага прыёму ў генпракурора Васілевіча: «Амаль гадзіну нас слухаў, але нават не знайшоў час адказаць на нашы скаргі, якія мы асабіста перадалі. Былі толькі адпіскі — нахабныя, грубыя, некампетэнтныя і г.д... І гэта пры тым, што ў „Советской Белоруссіі» той жа Васілевіч кажа, што, маўляў, мы такія дэмакраты — у нас непаўналетнія больш за тры месяцы не сядзяць...» Бацька называе гэтую крымінальную справу «справай Міхасевіча № 2».

«Па справе быў праведзены вялікі аб'ём аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, затрачаныя вялікія дзяржаўныя сродкі. І які вынік? З пэўнасцю следства не вызначыла нават час, месца, прыладу здзяйснення забойства. З моманту затрымання адпрацоўвалася толькі адна версія — версія пра вінаватасць хлопцаў. І была адна мэта ў следства — дамагчыся прызнання віны любой цаной... « - гэта вытрымка з прамовы адваката падчас судовых спрэчак.

**«Наша Ніва».**

# ВПЕРЁД — В ПРОШЛОЕ!

Все разговоры о модернизации нашей страны – не более, чем пропагандистская риторика. В заключительном слове на всебелорусском народном собрании Александр Лукашенко рассказал о своих идеалах. Ведут они в никуда.

Руководителя Беларуси с советским наследием роднят серьезные вещи.

-- Заметил, что очень грамотно, патриотично оправдываются наши делегаты за форум перед теми, кто его критикует, называя его чуть ли не съездом КПСС. До съезда КПСС нам еще далеко, до него мы еще не дотягиваем, но такая оценка нас вдохновляет, -- сказал глава Беларуси.

Вероятно, еще одним источником вдохновения является членский билет коммунистической партии Советского Союза, который Александр Лукашенко хранит до сих пор. Также руководитель суверенной Беларуси в очередной раз высказал сожаление о развале СССР.

Эти заявления перечеркивают рассуждения некоторых политологов, что Лукашенко-де морально готов перевести Беларусь на рельсы капитализма и даже демократизировать страну. Глава государства продемонстрировал, что у него принципиально иные ориентиры. Это, с одной стороны, объясняет, почему даже экономическая либерализация осуществляется так медленно и непоследовательно. А с другой, дает достаточно ясное представление о наших перспективах: ожидать, что при руководителе, котороый молится на съезд КПСС, страна будет модернизирована, по меньшей мере, наивно.

Лукашенко живет в прошлом и программирует на аналогичный режим существования всю страну. Его выступление на всебелорусском народном собрании действительно напоминает доклад генерального секретаря КПСС Л.И.Брежнева на очередном съезде партии. Цели определены, задачи поставлены, за работу, товарищи! Вперёд – в прошлое! Потому что в будущем для Александра Григорьевича места нет.

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна